Нашы юбіляры

РЫГОР ВАСІЛЬЕВІЧ БУЛАЦКІ
(Да 60-годдзя з дня нараджэння)

Рыгор Васільевіч Булацкі — чалавек зайздроснага жыццёвага лёсу. Ён нарадзіўся пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі — і гэта шчаслі-ва вызначыла ўсю далейшую дарогу выхадца з беднай многадзетнай сялянскай сям'і, што жыла ў вёсцы Мачулкі пад Бабруйскам. Пасля школы ён паступае ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, але вайна перарывае яго вучобу. Пасля заканчэння лётнага вучылішча Р. В. Булацкі служыць штурманам у авіяцыйным палку на Далёкім Усходзе, за тысячы кіламетраў ад фронта, дзе разгарнулася смяротная бітва паміж краінай Саветаў і цёмнымі сіламі фашызму. Гэта не дае спакою маладому воіну і яго сябрам, яны пішуць рапарт з просьбай накіраваць іх у дзеючую армію. І атрымліваюць адмову за адмовай. Тады яны па прыкладу многіх савецкіх патрыётаў збіраюць сродкі на будаўніцтва самалёта і выказваюць жаданне ваяваць на гэтым самалёце. Вярхоўны Галоўнакамандуючы шле лётчыкам-сябрам В. Л. Ульянаву, А. Д. Пятрову і Р. В. Булацкаму віншавальную тэлеграму і дазвол ваяваць на «сваім» бамбардзіроўшчыку.

У гарачым, смяротна небяспечным небе Украіны, Венгрыі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Аўстрыі пракладваў баявыя трасы штурман Р. В. Булацкі. Экіпаж грознай машыны наносіў бомбавыя ўдары па скапленнях жывой сілы і тэхнікі фашыстаў. Але аднойчы самалёт быў збіты снарадам ворага. Цяжкае раненне, шпіталь — і зноў лейтэнант Р. В. Булацкі рвецца ў бой. Дзень Перамогі ён адзначыў баявым вылетам на бамбардзіроўку фашысцкіх войск, якія імкнуліся задушыць Прагу.

Усё наступнае жыццё Р. В. Булацкага звязана з універсітэтам. Пасля заканчэння журфака ён некалькі гадоў рэдагуе шматтыражную газету «Беларускі універсітэт», вучыцца ў аспірантуры, затым пераходзіць на выкладчыцкую работу. Вялікая працаздольнасць, настойлівасць у дасягненні мэты, уменне бачыць галоўныя праблемы і на іх скіраваць свае намаганні — вось чым адметны рабочы почырк Р. В. Булацкага. Ён абараняе кандыдацкую дысертацыю, першым у рэспубліцы праводзіць шырокія даследаванні па гісторыі партыйна-савецкага друку Беларусі. Адна за адной выходзяць кнігі, якія становяцца значнай з'явай у навуковым жыцці: «З гісторыі партыйна-савецкага друку Беларусі», «Оружием слова», «Первые рабселькоры Белоруссии», «Ленінскай гвардыі салдат» і іншыя.

У 1970 годзе Р. В. Булацкі паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «У. І. Ленін і публіцысты ленінскай школы», каторай ён унёс шмат новага ў распрацоўку гісторыка-гнасеалагічнага напрамку савецкай навукі аб журналістыцы. У сваіх кнігах ён даследуе публіцыстычную дзейнасць А. В. Луначарскага, П. М. Лепяшынскага, Кузьмы Чорнага, Платона Галавача, Веры Харужай, К. С. Ерамеева... Вядзе вялікую навукова-педагагічную работу: пад яго кіраўніцтвам ці з яго дапамогай абаронена каля трыццаці кандыдацкіх і некалькі доктарскіх дысертацый, у творчай садружнасці са сваімі былымі вучнямі, а цяпер калегамі І. І. Сачанкам і С. В. Говіным Р. В. Булацкі выпусціў фундаментальную «Гісторыю беларускай журналістыкі».

Аднак паўней за ўсё энергія Р. В. Булацкага, яго дзелавыя і маральныя

якасці, прынцыповасць камуніста і чуласць праявіліся на пасту дэкана факультэта журналістыкі. Яго рабочы кабінет заўжды поўны студэнтамі, выкладчыкамі, рознымі людзьмі, што прыходзяць за парадай, дапамогай, проста за добрым словам. Разам з тым гэта вельмі патрабавальны чалавек. Гэтыя якасці Р. В. Булацкага добра вядомы не толькі тым, хто працуе і вучыцца на журфаку; менавіта таму ў свой час камуністы універсітэта аказалі яму высокае давер'е, абраўшы сакратаром парткома.

5 мая, у Дзень друку, Р. В. Булацкаму спаўняецца 60 год. Многія здзівяцца, даведаўшыся пра гэта. Заўжды рухавы, энергічны, ён робіць уражанне маладога чалавека. Ён і застаецца малады душой. Напярэдадні юбілею жадаем яму моцнага здароўя, бадзёрасці і нястомнасці ў шматграннай працы.

Калектыў супрацоўнікаў
факультэта журналістыкі

ВАСІЛЬ АНДРЭЕВІЧ ПЫЖКОЎ
(Да 60-годдзя з дня нараджэння)

Споўнілася 60 гадоў Васілю Андрэевічу Пыжкову—вядомаму беларускаму журналісту і вучонаму, прафесару нашага універсітэта.

Яго працоўны шлях пачаўся з маленькіх заметак, што рэгулярна з'яўляліся за подпісам «Селькор В. Пыжкоў» у раённай газеце «Бальшавік Мсціслаўшчыны». Яны, тыя першыя публікацыі, падказалі яму думку: каб быць сапраўдным газетчыкам, трэба многа ведаць. 15-гадовы хлопец з вёскі Валымер Мсціслаўскага павета Смаленскай губерні паступае ў Магілёўскую газетна-партыйную школу. Пасля заканчэння яе прафесіянал-газетчык В. А. Пыжкоў на працягу 30 гадоў (1938—1968) самаддана служыць беларускай журналістыцы. Вось важнейшыя этапы гэтага перыяду: загадчык аддзела, адказны сакратар мсціслаўскай раёнкі «Калгасная газета»; літсупрацоўнік, уласны карэспандэнт газеты «Камунар Магілёўшчыны»; загадчык аддзела, намеснік рэдактара, першы намеснік рэдактара газеты «Советская Белоруссия»; рэдактар газеты «Звязда». Па-асабліваму творча насычанымі аказаліся гады работы ў «Звяздзе» (1954—1968). У гэты час ён заканчвае факультэт журналістыкі БДУ, уступае ў Саюз савецкіх журналістаў, становіцца адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў Саюза журналістаў БССР. Іменна ў гэтыя гады ён абараняе кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, прысвечаныя пытанням тэорыі і практыкі прэсы. Іменна ў гэтыя гады ён выдае свае першыя кнігі па журналістыцы «Друк Беларусі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXI з'езда КПСС» і «Газета і сучаснасць», якія разам з яго даследаваннямі, выпушчанымі пазней, і цяпер служаць добрай падмогай для нашых студэнтаў і газетных работнікаў. У гэтыя гады В. А. Пыжкоў прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычнай дзейнасці: на пяці з'ездах Кампартыі Беларусі выбіраўся членам ЦК КПБ, быў дэпутатам Вярхоўнага Савета трох склікання, дэпутатам Мінскага гарсавета. Двойчы ў саставе дэлегацыі Урада БССР ён прадстаўляў нашу рэспубліку на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН.

З 1968 года В. А. Пыжкоў — прафесар кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Прызнаны тэарэтык і практык друку, ён перадае свой вопыт маладым калегам, працягвае дослед беларускай перыёдыкі. Ён вядзе курс «Праблематыка газетных выступленняў» і спецсемінар «Актуальныя праблемы публіцыстыкі». За час работы ва універсітэце ім напісана дзве манаграфіі—«Журналіст у эканамічным пошуку» і «Ад партрэта сучасніка да гісторыі сучаснасці», некалькі навуковых артыкулаў, ён выступае на старонках газет. Свой уклад уносіць і ў падрыхтоўку навуковых кадраў: сярод яго вучняў—адзін доктар і чатыры кандыдаты навук.

Камуніст В. А. Пыжкоў актыўна выконвае партыйныя і грамадскія даручэнні: ён — намеснік сакратара партбюро факультэта, старшыня метадычнай камісіі, сакратар агульнаўніверсітэцкай арганізацыі Саюза журналістаў БССР.

Заслугі Н. А. Пыжкова высока ацэнены КПСС і Савецкім урадам. Ён узнагароджаны ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны», медалямі і Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР».

У росквіце творчых сіл сустракае юбіляр сваё шасцідзесяцігоддзе. Жадаем Вам, Васіль Андрэевіч, як мага больш творчых радасцей, здароўя, шчасця.

В. І. Дубовік.